*Т.М. Шаршнёва, І.М. Ячмянёва* (*г. Магілёў*)

# НАЗВЫ ПАВЫШЭННЯЎ РЭЛЬЕФУ Ў МІКРАТАПАНІМІІ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

Назвы павышэнняў рэльефу ўтвараюць даволі значную па колькасці і разнастайную па складзе групу мікратапонімаў.

Найбольш актыўны ў мікратапанімічнай функцыі тэрмін *гара* (дэм. *горка*) у значэнні 'ўзвышэнне', 'невысокі марэнавы або пясчаны ўзгорак, звычайна круглы або стромкі з аднаго боку' [3, с. 46]. Найчасцей гэты апелятыў утварае састаўныя назвы, азначальны кампанет якіх указвае на *асобу чалавека (людзей)*: Адамава Гара. узг. (Сліжы Шкл.), Байдава Гара. узг. (Гаі Маг.), Хадоркіна Гара. узг. (Кананавічы Кругл.), Цыганскія Горы. узг. (Барсукі Бых.), Ягорава Горка. узг. (Старая Вадва Шкл.). На ўзвышаным месцы ў мінулым часта знаходзіўся дом пана, папа, ксяндза, стаяла царква, касцёл, крыж, таму нярэдкімі ў мікратапаніміі з'яўляюцца назвы Ксёндзава Гара. узг. (Наваселле Маг.), Панская Гара. узв. (Вялікая Машчаніца Бял.), Папові Горы. п. (Данькавічы Шкл.), Богава Гара. узг. (Вольніца Бял.), Царкоўная Гара. узг. (Смаліца Бых.), Крыжава Гара. узг. (Абідавічы Быx.). У асобных выпадках азначальны кампанент указвае на тое, што ўзгорак з'яўляецца месцам здабычы пяску, гліны або сведчыць пра наяўнасць рознага плану карысных выкапняў у структуры яго глебы: Абрытая Гара. узг. (Сапронькі, Гарадок Шкл.) – з узгорка ў мінулым бралі пясок для будаўніцтва, Цагельная Гара. узв. (Крычаў) – на ўзвышаным месцы пабудаваны цагельны завод; Красная Гара. узв. (Белы Камень Бял., Галічы Клім.) – узвышаная мясціна з чырвонай глінай; Мелавая Гара. лаг. (Зарубец Крыч.) – тут здабываюць мел. Назвы пляскатых узвышэнняў, бедных на расліннасць, неўрадлівых, з пясчанай глебай часта маюць назву Лысая Гара: п. (Машчаніца Бял.), лг. (Трасціно Хоц.), п. (Буглаі Краснап.). Нярэдка гэта былыя курганы: Лысая Гара. ур. (Вішоў Бял., Радамля Чав.). Даволі распаўсюджаны мікратапонімы, дзе атрыбутыў указ-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гае на жывёл і птушак: Кабыляцкая Гара. узг. (Белая Шкл.), Каровіна Гара. узг. (Шупені Кругл.), Ластаўчына Гара. узг. (Гаспады Дрыб.), Лісіная Гара. узг. (Ількавічы Бял.), Мядзведжая Гара. узг. (Махава Маг.), Свіная Гара. уч.л. (М. Дубраўка Маг.). Спарадычна аб'екты характарызуюцца паводле *тапаграфічных асаблівасцей*: Вострая Гара. узг. (Леніна Краснап.), Высокая Гара. узг. (Смагілаўка Кругл.), Крутая Гара. кан. (Загараны Кругл.); паводле ўказання на *айконім*: Рыжкаўская Гара. узг. (Рыжкавічы Шкл.), Траслянская Гара. узв. (Тросна Шкл.).

Тэрмін *гара* актыўна ўдзельнічае ва ўтварэнні складаных назваў: Канецгара лг. (Вайнічы Чав.) (< *канецгара* 'ўзгорак з абрывам'), Краснагорка. узв. (Сапронькі Шкл.), Станок-Гара п. (Кішчыцы Шкл.) (У межах поля ёсць *стан* 'месца, дзе летам стаяць каровы'), Мелгара. узг. (Дразды Кругл., Высокае Клім.) (< *мелгара* 'ўзгорак, на якім здабывалі мел'), Мір-Гара. узг. (Палкі Вых., Высокае Чав.) (Паводле падання, тут калісьці князі заключалі мір). Засведчана лексема *гара* і ў складзе прыназоўнікава-іменнай канструкцыі Пад Гару. лг. (Лудчыцы Бых.).

Ва ўтварэнні аднакампанентных назваў азначаны тэрмін удзельнічае нячаста: Горка. узг. (Адаменка Бых.), Горкі. л. (Мокрае Бых.), Горы. узг. (Барчыцы Кір., Лудчыцы, Уюн Бых., Коўбча Кліч.). І.Я. Яшкін адзначае, што ў беларускіх гаворках тэрмін *горы* абазначае 'доўгі рад прыгоркаў; гарыстая мясцовасць', 'насыпы ў лесе, магільнікі, валатоўкі' [4, с. 208].

У складзе невялікіх груп мікратапонімаў выяўлены тэрміны *ўзгорак* 'невялікая горка, узвышэнне з пакатымі схіламі; пагорак' [4, с. 682]: Аляксееў Узгорак. узг. (Семукачы Маг.), Рыбацкі Узгорак. узв. (Утра Маг.); *прыгорак* 'узгорак, узвышанае месца': Янкавы Прыгоркі. узг. (Александрыя Шкл.); *бугор* 'узгорак, пагорак, невялікая гара; узвышанасць, высокае месца' [3, с. 26]: Бугор. узв. (Ахімкавічы-1 Кругл.), Бугры. п. (Слаўня Слаўг., Чорны Бор Бых.), л. (Адаменка Бых., Недзведзь Клім.), Папоў Бугор. узг. (Гарадзец Бых.); *буг* 'узвышанае месца, высокі бераг': Высокі Буг. лг. (Высокае Шкл.), Ластаўкін Буг. к-р. (Боўсевічы Бял.); *бугранік* 'узгорыстая камяністая мясціна': Буграннік. узг. (Лазовіца Клім.).

Асновай для мікратапонімаў Пагор'е. узг. (Сухары Маг.), Падгор'е. п. (Малыя Аўчыненкі Шкл.), с-ць. (Новы Быхаў Бых.), Падгорыца. уч.л. (Данькавічы Шкл.), Падгорная. л. (Восаў Красн.), Падгара. узл. (Каменка Чав.), Арлоўскі Падгорак. д. (Утра Маг.), Прыгор'е. ч.в. (Бахані Бял.) сталі мясцовыя апелятывы *пагор'е* 'гарыстая мясціна', *падгорак, падгор'е, падгорыца, падгорная, падгара, прыгор'е* 'мясціна каля ўзгорка, паблізу ўзгорка'.

Лексема *гарышча* зафіксавана ў значэннях 'узвышанае месца, узгорак', 'стромая гара; круты бераг': Гарышча. п. (Чырвоны Бор Бял.), уч.л. (Сідаравічы Маг.), узг. (Вялікія Лазіцы Шкл.), узв. (Дужаўка Чав., Аржаўцы Шкл.).

Невялікая група мікратапонімаў матывавана тэрмінам *грыва* (дэм. *грыўка*) 'узвышша; высокае, прадаўгаватае, аблямаванае лесам месца', 'паласа якой-небудзь расліннасці сярод лугу, поля, вадаёма' [3, с. 54]: Высокая Грыва. узг. (Цяхцін Бял., Лыкава Маг.), ч.л. (Прыбар Бял.), Конская Грыва. узв. (Прыбар Вял.), Лысая Грыва. узг. (Прыбар Бял.).

З падобнымі значэннямі зафіксаваны лексемы *града, градавіна, градзь* 'вузкая паласа глебы, расліннасці, якая чым-небудзь вылучаецца з навакольнай мясцовасці', 'паласа цвёрдай глебы сярод забалочанай мясцовасці' [2, с. 543; 3. с. 52]: Аніськава Града. узв. (В'юн, Сядзіч Бых.), Града. лг. (Вепрын Чэрык.), Папова Града. л. (Гаваракі Шкл.), уч.р. (Дрычын Асіп.), Градавіна. л. (Болін Красн.),Градзь. уч.л. (Молатаў Слаўг., Макаранцы Маг.); *верацця, верацяя, верацей* 'узгорак, узвышша сярод балота', 'лес сярод балота', 'узвышанае сухое месца на няўдобіцах, якое можна апрацоўваць': Верацця. л. (Свенск Слаўг.), Верацяя. л. (Валынеж Касц.), Верацеі. узв. (Слабада Вых.), Верацей. л. (Стайкі Маг.); *вал* 'доўгі высокі земляны насып', 'доўгі грэбень кустоў з карэннем пры раскарчоўванні, ачышчэнні земляў, пры меліярацыі', 'высокае месца, груд сярод балота' [4, с. 130]: Вал. узг. (Новы Быхаў Бых., Лазаравічы Бых.), п. (Чавусы), узв. (Елькаўшчына Кругл.), Валы. п. (Ліпск Бял., Навабрашчына Шкл.), лг. (Плешчыцы Шкл.), уч.л. (Літоўск Кругл.), узг. (Махава Маг.). У складзе адзінкавага мікратапоніма зафіксаваны тэрмін *павалашніца* 'ўзвышанае сухое месца сярод балота': Павалашніца. узв. (Зацішша Касц.). Найбольш верагодна, лексема звязана са словам *вал*: па-*вал*-аш-ніца.

Тэрмін *груд* засведчаны ў складзе некалькіх мікратапонімаў у значэннях 'сенажаць сярод лесу', 'невялікая горка': Анісімаў Груд. с-ць. (Гарадзец, Русакі Шкл.), Вялікі Груд. с-ць. (Поўстка Глуск.), Свіны Груд. ур. (Данькавічы Шкл.), Грудное Балота. б. (Кішчыцы Шкл.).

Лексемы *востраў* (дэм. *астравок*), *астравіна* засведчаны і як 'частка сушы, акружаная з усіх бакоў вадой', і як 'участак, які вылучаецца чым-небудзь сярод навакольнай мясцовасці: сухое месца сярод балота, лугу, невялікі лес сярод поля і пад.' [4, с. 158]: Востраў. уч.л. (Добрая Гор.), узв. (Пральня Бял.), л. (Красавічы Клім.), Змяіны Востраў. в-ў. (Праточнае Бых.), Астравок. п. (Белая Шкл.), Астравіна. б. (Ямнае Бых.),

У значэннях 'частка сушы каля вады, якая граніцыць з вадой', 'высокі бераг ракі' [3, с. 23] ужываецца тэрмін *бераг* (рэг. *беразь*, дэм. *беражок*), пераважна ў складзе састаўных мікратапонімаў: Абрывісты Бераг. уч. бер. (Пральня Вял.), Адамаў Бераг. бер. р. (Следзюкі Бых.), Александрыйскі Бераг. бер. р. (Александрыя Шкл.), Верын Бераг. бер.р. (Лубяны Бял.), Высокі Бераг. уч.р. (Эсьмоны Бял.), Лысы Бераг. бер.р. (Глуск Маг.), Беражкі. ч.л. (Пуцькі Чав.), Беразь. бер.воз. (Гавяды Шкл.).

Мікратапанімія рэгіёна зафіксавала шэраг назваў, суадносных з апелятывамі, агульнае значэнне якіх 'высокая гара; круты спуск, схіл гары, берага': *абрыў, касагорак, касагор'е, круча, ускрučча, скала*: Абрыў. бер.р. (Пудаўня Дрыб.), уч. бер. (Стараселле Шкл.), Касагорак. л. (Прыбар Бял.), Касагор'е. уч.л. (Вялікія Лазіцы Шкл.), Круча. л. (Раманавічы Маг.), бер.р. (Чырвоны Бор Бял.), лг. (Сапронькі Шкл.), Красная Круча. уч.бер. (Абідавічы Бых.), Кручы. куп. (Лудчыцы Бых.), л. (Князеўка Маг.), Ускручча. бер.р. (Масцішча Бял.), Скала. уч.р. (Дужаўка Чав.).

У асобных выпадках крутыя берагі вадаёма становяцца прыметай, што кладзецца ў аснову мікрагідроніма, параўн. Круча р. (Конанаўка Чав.) – рака з крутымі берагамі. Кручы куп. (Лудчыцы Бых.) – купальня.

Некалькі мікратапонімаў утварылася ад асновы *лоб-, лаб-*: Лабавіна. паг. (Ігліца Бял.), Лабкі. п. (Благавічы Чав.), Лабяк. паг. (Стараселле Бял.), Лабанаўка. узг. (Конанаўка Чав.), Лобаўшчына. п. (Чэрнеўка Шкл.) У мясцовых гаворках тэрміны ўжываюцца ў значэннях *лабавіна* – 'вялікі пагорак', *лабяк* – 'вяршыня ўзвышша, узгорак', *лабок* – 'высокае адкрытае месца, узгорак; курган', 'выступ на раўніне, узвышэнне на роўным месцы'.

Састаўной часткай асобнай групы мікратапонімаў стала лексема *горб* 'невялікая пакатая горка', 'высокі пагорак' [4, с. 207]. Яна зафіксавана як ў складзе простага мікратапоніма ў форме множнага ліку: Гарбы. п. (Халмы Маг.) (< *гарбы* 'поле з мноствам невялікіх узгоркаў'), так і ў складзе такіх тэрмінаў, як *гарбатка, горбаўка* 'няроўнае, з узгоркамі поле', *горбаўкі* 'гарыстая мясцовасць'): Гарбатка. п. (Смолка Чав.), Горбаўка. п. (Сідаравічы Маг.), Горбаўкі. л. (Камяніца Бял.).

Разнастайныя апелятывы, што перадаюць назвы ўзвышшаў і іх частак, адлюстраваліся ў мікратапонімах Вярхі. узв. (Пятравічы Бых.) (< *верх* 'узвышанае месца', 'вяршыня ўзгорка'), Верхань. бер.р. (Дрычын Асіп) (< *верхань* 'высокі бераг ракі'); Вугрыў. узг. (Петухоўка Чав.) (< *вугрыў* 'узгорак, на якім у спёку вельмі горача'; Нахілле. ч.л. (Мерч Шкл.) (< *нахілле* 'пакаты схіл гары, узгорка'); Камаркоў Юрок. уч.л. (Сідаравічы Маг.) (< *юрок* 'узвышша, адкрытае высокае месца'); Холм. узв. (Аляксандраўка Чав.), Халмы. л. (Александрыя Шкл.), Шамбалавы Халмы. узв. (Пашкава Маг.) (< *холм* 'высокае месца, вялікі ўзгорак'); Каўзун. узг. (Дужаўка Чав.) (< *каўзун* 'узгорак, на якім зімой коўзаюцца дзеці'); Віжгор. узв. (Высокае Чав.) (< *віжгор* 'віднае з усіх бакоў, высокае месца'); Алёнін Пуп. узв. (Высокае Шкл.) (< *пуп* 'узвышанае, не парослае лесам месца'); Бубен. с-ць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(Пятровічы Чав.) (< *бубен* 'узвышанае, беднае травастоем месца'); Скаварада. узв. (Альшаннікі Кругл.) (< *скаварада* 'пляскатае ўзвышанае месца').

У асобную падгрупу можна вылучыць мікратапонімы, ва ўтварэнні якіх удзельнічалі тэрміны *курган* (*дэм. курганок*), *капец, валатоўка* з агульным значэннем 'узгорак', 'старадаўні магільны насып' [11, с. 102]. Лексема *курган* з'яўляецца асновай для вялікай колькасці аднакампанентных назваў: Курган. л. (Петухоўка Чав., Сісенева Шкл., Дубраўка Маг.), лг. (Вайнілы Маг., Капані Чав., Смолка Чав.), ур. (Малыя Аўчыненкі Маг., Таранава Маг., Славені Шкл., Навасёлкі Маг., Рэпішча Маг.), узв. (Лямніца Бял.), л. (Халмы Чав.), Курганы. п. (Гарадок Шкл., Прысна 1 Маг.), узв. (Вішоў Бял.).

У складзе састаўных мікратапонімаў тэрмін *курган* у асноўным канкрэтызуецца атрыбутывамі, якія ўказваюць на *асобу чалавека* (*людзей*): Аўсееў Курган. узв. (Сідаравічы Маг.), Аўхачоў Курган. узв. (Аўчыненкі Шкл.), Малахаў Курган. узв. (Антонаўка Чав.), Сідараў Курган. узг. (Гарадзец Шкл.), Шведскія Курганы. узв. (Новая Слабада Слаўг.) (У курганах, па словах мясцовых жыхароў, былі пахаваны шведы), Яўрэйскі Курган. узг. (Дашкаўка Маг.) (Тут былі яўрэйскія могілкі); на *айконім*: Капысіцкія Курганы. узг. (Капысіца Шкл.).

Засведчаны дэрываты тэрміна *курган* у складзе мікратапонімаў Курганішча. ч.л. (Асман-Касаева Бял.), л. (Антонаўка Чав.) (< *курганішча* 'мясціна на кургане', 'мясціна са мноствам курганаў'; Курганка. пал. (Дуброва Кругл.) (< *курганка* 'мясціна, дзе ёсць курган'); Курганкі. с-ць. (Чачэвічы Бых.) (< *курганкі* 'мясціна са мноствам невялікіх узгоркаў', 'куп'істая сенажаць'); Курганне. л. (Савелінкі Шкл.), ур. (Троіца Шкл.), п. (Вець Бых., Язёры Кругл.), узв. (Стайкі Маг.), ч.л. (Чырвоны Бор Бял.) (< *курганне* зборн. 'мясціна з мноствам курганаў', 'куп'істае поле').

У якасці назваў старажытных насыпаў ужываюцца і такія тэрміны, як *валатоўка* 'магільны курган бронзавага веку', 'вялікі прыродны ўзгорак' [3, с. 31]: Валатоўка. уч. л. (Княжыцы Маг.), Валатоўкі. л. (Малатоўкі Бял.); *каптур, капец* 'узгорак', 'старадаўні магільны насып': Каптуры. узг. (Комсенічы Кругл.), Капец. узг. (Дрыбін Гор.).

Як сведчаць дадзеныя археалагічных раскопак, мікратапонімы, у склад якіх уваходзяць лексемы *гара, горка, курган, валатоўка, капец, каптур*, сапраўды часта з'яўляюцца назвамі старажытных курганных пахаванняў. Даследчыца Л.У. Дучыц адзначае: "На тэрыторыі Беларусі курганы з'явіліся ў эпоху бронзы і ранняга жалезнага веку. Асноўная маса курганных могільнікаў належыць да канца 1-га – пачатку 2-га тысячагоддзя. Ёсць курганныя насыпы часоў позняга сярэдневякоўя" [1, с. 760]. Нягледзячы на тое што ўзніклі курганы вельмі даўно, на Магілёўшчыне бытуе шмат легендаў і паданняў, звязаных з падзеямі адносна нядаўняй гісторыі: пра тое, што ў курганах пахаваны "загінуўшыя воіны", звычайна гэта "шведы" або "французы".

Такім чынам, у мікратапаніміі даследаванай тэрыторыі знайшлі значнае пашырэнне назвы павышэнняў рэльефу. На фоне пануючых нізінных і раўнінных форм рэльефу ўзгоркі станавіліся добрымі арыенцірамі, і таму геаграфічныя тэрміны нярэдка анімізаваліся, пераходзячы ў разрад мікратапонімаў. У пераважнай большасці выпадкаў назвы мікрааб'ектаў адлюстроўваюць рэальныя тапаграфічныя прыметы аб'ектаў: яны замацаваны за рознага плану ўзвышэннямі паверхні або мясцовасцямі, характэрнай адзнакай якіх сталі ўзгоркі, бугры.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Дучыц, Л.У.** Курган / Л.У Дучыц // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1: Акапэла – Куцця / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2005. – С. 760.
2. Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны / С.В. Клімуць [і інш.]; пад аг. рэд. В.І. Рагаўцова. – Магілёў, 2004. – 208 с.
3. **Яшкін, І.Я.** Беларускія геаграфічныя назвы. Тапаграфія. Гідралогія / І.Я. Яшкін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 256 с.
4. **Яшкін, І.Я.** Слоўнік мясцовых геаграфічных тэрмінаў: Тапаграфія, Гідралогія / І.Я. Яшкін. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 808 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова